Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

24 ЛЮТАГА 2007 г. СУБОТА

№ 38 (25903)

Кошт 350 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## Беларусь уносіць рэальны ўклад у падтрыманне стабільнасці ў Еўропе

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 23 лютага прыняў удзел ва ўрачыстых мерапрыемствах з нагоды Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.**

Аляксандр Лукашэнка ўсклаў вянок да манумента Перамогі ў Мінску. На цырымоніі прысутнічалі прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі, старшыні абедзвюх палат парламента Генадзь Навіцкі і Уладзімір Канаплёў, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Генадзь Нявыглас, іншыя вышэйшыя службовыя асобы.

У гэты дзень вянкі да помніка ляглі таксама ад сенатараў і дэпутатаў парламента, ветэранаў, сілавых структур, Мінскага гарадскога і абласнога выканаўчых камітэтаў, прадстаўнікоў СНД, Еўрасаюза, праваслаўнай і каталіцкай цэркваў, маладзёжных і прафсаюзных арганізацый, дыпламатычнага корпуса.

Памяць загінулых абаронцаў Айчыны ўшанавалі мінутай маўчання. Пасля выканання Дзяржаўнага гімна Беларусі зводная рота ганаровай варты і аркестр Галоўнай ваеннай камендатуры прайшлі па плошчы ўрачыстым маршам.

Затым Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у святочным прыёме кіруючага складу Узброеных Сіл і праваахоўных органаў з нагоды Дня абаронцаў Айчыны.

Як адзначыў Прэзідэнт, 23 лютага сімвалізуе непарыўную сувязь усіх пакаленняў абаронцаў Айчыны, пераемнасць лепшых воінскіх традыцый. Паводле яго слоў, гэта свята тых, хто сумленна і аддана служыць Радзіме, хто ўсе сілы і веды, энергію і талент, цярплівасць і волю прысвяціў служэнню свайму народу. «Гэта свяшчэнны дзень і для тых, хто ў суровы для Радзімы час станавіўся на яе абарону», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён нагадаў, што на долю нашай шматпакутнай краіны выпала нямала цяжкіх выпрабаванняў. «Але армія і народ заўсёды грудзьмі паўставалі за сваю зямлю, праяўляючы адзінства і стойкасць, доблесць і адвагу», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт выказаў шчырыя словы ўдзячнасці ветэранам. «Яны адстаялі свабоду і незалежнасць Радзімы. А цяпер на сваім прыкладзе вучаць моладзь сапраўднаму патрыятызму, адданасці абавязку і прысязе, з аптымізмам і ўпэўненасцю глядзець у будучыню. Нізкі паклон нашым ветэранам,» — сказаў беларускі лідар.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, абстаноўка на планеце не дае падстаў для бесклапотнасці. Тэрарызм і лакальныя войны дэстабілізуюць краіны і цэлыя рэгіёны. Імкненне да дыктату сілы, палітычны экстрэмізм, інфармацыйныя войны падрываюць рэгіянальную і сусветную стабільнасць, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Пры гэтым ён заявіў, што Беларусь можа паспяхова развівацца ў сучасных умовах і процістаяць пагрозам і выклікам.

Як падкрэсліў Прэзідэнт, наша краіна стала прыкладам палітычнай і сацыяльнай стабільнасці. І ў гэтым вялікая заслуга сілавых структур, праваахоўных органаў і спецыяльных службаў.

Надзейная абарона дзяржаўных інтарэсаў і ўмацаванне абароннага патэнцыялу — залог мірнай стваральнай працы беларускіх грамадзян, аснова паспяховага развіцця рэспублікі. Менавіта таму, адзначыў Прэзідэнт, у Беларусі такая вялікая ўвага надаецца ўсямернаму ўдасканаленню і развіццю Узброеных Сіл.

«Баявая магутнасць нашай арміі вызначаецца не колькасцю, а прафесійнай вывучкай асабістага складу і высокай тэхнічнай аснашчанасцю», — заявіў беларускі лідар.

Ён адзначыў, што Беларусь уносіць рэальны і неасПрэчны ўклад у падтрыманне міру і стабільнасці ў Еўропе. Сучасная беларуская армія з'яўляецца магутным стабілізуючым фактарам рэгіянальнай бяспекі. «Гэта дае магчымасць праводзіць паслядоўную і прынцыповую знешнюю палітыку», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, дзяржаўная граніца Беларусі стала надзейнай перашкодай транснацыянальнай злачыннасці. «Але мы ніколі не разглядалі сваю граніцу як раздзяляльную лінію паміж Усходам і Захадам», — заявіў Прэзідэнт.

«Па волі лёсу Беларусь апынулася на перакрыжаванні еўрапейскіх дарог. І мы адкрыты ўсяму добраму і карыснаму, што прыходзіць да нас, незалежна ад боку свету, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Але ўмешвацца ў свае ўнутраныя справы мы, вядома, нікому не дазволім. Наша асноўная задача — засцерагчы беларускі народ ад навязвання чужой волі і насілля».

Ён выказаў упэўненасць у тым, што прафесіяналізм, афіцэрскі гонар і высокая адказнасць за лёс Айчыны, уласцівыя ваеннаслужачым Узброеных Сіл, іншых сілавых структур, дапамогуць паспяхова вырашыць самыя складаныя задачы, захаваць суверэнітэт, забяспечыць далейшае развіццё нашай краіны.

На ўрачыстым прыёме Прэзідэнт уручыў генеральскія пагоны беларускім ваенным і супрацоўнікам праваахоўных органаў.

У адпаведнасці з указам кіраўніка дзяржавы воінскае званне генерал-маёра прысвоена палкоўніку Аляксандру Балігатаву, палкоўніку Івану Гардзейчыку, палкоўніку Ігару Сяргеенку, палкоўніку Валерыю Маслакову. Спецыяльнае званне генерал-маёра міліцыі прысвоена палкоўніку міліцыі Сяргею Гурэеву і палкоўніку міліцыі Віктару Жыбуртовічу.

Прэзідэнт павіншаваў беларускіх ваенных і супрацоўнікаў праваахоўных органаў з Днём абаронцаў Айчыны і прысваеннем вышэйшых афіцэрскіх званняў, падзякаваў за сумленную і бездакорную службу, пажадаў поспехаў у службе на карысць Айчыны.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Сенатары Анатоль Малафееў, Мікалай Чаргінец і Людміла Пастаялка ўдастоены дзяржаўных узнагарод

Старшыні пастаянных камісій Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу ўдастоены дзяржаўных узнагарод. Адпаведны ўказ Прэзідэнт Беларусі падпісаў 22 лютага. Ордэнам Айчыны II ступені ўзнагароджаны старшыня камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню Анатоль Малафееў, ордэнам Айчыны III ступені — старшыня камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Мікалай Чаргінец. Старшыня камісіі па дэмаграфічнай бяспецы і сацыяльнаму развіццю Людміла Пастаялка адзначана ордэнам Пашаны.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ЛЕСНІКА МАРОЗАМ НЕ НАПАЛОХАЦЬ



*Невялікі абедзенны перапынак брыгады леснікоў і лесарубаў з вёскі Папялёва Пружанскага раёна, якую ўзначальвае Мікалай ПІЛЮЦІК (на здымку злева).*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Мінулай ноччу ў Беларусі зарэгістравана рэкордна нізкая для гэтай зімы тэмпература

Рэкордна нізкая тэмпература паветра для гэтай зімы была зарэгістравана на метэастанцыі Езярышча Глыбоцкага раёна, дзе слупок тэрмометра апусціўся да адзнакі мінус 33 градусы. У нядзелю, 25 лютага, з'явіцца воблачнасць. Удзень месцамі ў Брэсцкай і Гродзенскай абласцях пройдзе невялікі снег. Уначы захаваюцца моцныя маразы, а ўдзень тэмпература паветра складзе мінус 7—13 градусаў. На захадзе краіны будзе мінус 3—6 градусаў. У нядзелю падзьме рэзкі паўднёва-ўсходні вецер, месцамі яго парывы дасягнуць 12—14 метраў за секунду.

**БЕЛТА.**

# НОВЫ КОДЭКС АБ ЗЯМЛІ

## планауецца прыняць вясной

**На веснавой сесіі Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі плануе прыняць у другім чытанні праект Кодэкса аб зямлі. Якія палажэнні ўтрымлівае кодэкс?**

Як вядома, сёння існуе пяць тыпаў правоў на зямлю: уласнасці, пажыццёва спадчыннага валодання, пастаяннага карыстання, часовага карыстання і арэнды. Замест гэтага планауецца пераход да двух асноўных тыпаў правоў — уласнасці і арэнды. Як лічыць старшыня камісіі Палаты прадстаўнікоў па аграрных пытаннях Міхаіл Русы, такі пераход адбываецца ў мэтах ліквідацыі схаванага зямельнага рынку, уцягнення зямельных участкаў і правоў на іх у грамадзянскі абарот.

Пры гэтым у пастаяннае карыстанне зямельныя ўчасткі будуць прадастаўляцца толькі для будаўніцтва і абслугоўвання аб'ектаў нерухомай маёмасці, што знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці, юрыдычным асобам для вядзення сельскай гаспадаркі, жыллёва-будаўнічым кааператывам і таварыствам уласнікаў.

У мэтах абароны правоў грамадзян Беларусі права пажыццёва спадчыннага валодання зямельным участкам, якое было прадастаўлена да прыняцця праекта кодэкса, захаваецца. Пасля ж прыняцця дакумента на гэтым праве зямельныя ўчасткі будуць прадастаўляцца грамадзянам Беларусі, якія пражываюць у сельскіх населеных пунктах, пасёлках гарадскога тыпу для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома, абслугоўвання зарэгістраванай кватэры ў блочным жылым доме, вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі; у выпадку атрымання ў спадчыну зямельнага ўчастка, які раней прадастаўляўся спадчынадаўцу ў пажыццёва спадчыннае валоданне; для абслугоўвання перададзеных па спадчыне або падораных блізкімі роднымі жылога дома, зарэгістраванай кватэры ў блочным жылым доме, дачы, садовага доміка, што размешчаны на зямельных участках, раней прадастаўленых у пажыццёва спадчыннае валоданне; для вядзення сялянскай (фермерскай) гаспадаркі.

У адпаведнасці з Кодэксам аб зямлі, які дзейнічае зараз, мінімальны тэрмін арэнды зямельных участкаў для вядзення сельскай гаспадаркі складае пяць гадоў. Новы кодэкс павышае гэты мінімальны тэрмін да 10 гадоў. Паводле слоў М. Русага, гэта норма ўзмацняе гарантыі абароны правоў арандатара. Тэрмін жа арэнды зямельных участкаў, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці і прадастаўляюцца для мэтаў, звязаных з будаўніцтвам і абслугоўваннем капітальных будынкаў, павінен быць не меншым за нарматыўны тэрмін эксплуатацыі гэтых капітальных будынкаў.

Пры арэндзе зямельных участкаў будзе спаганяцца плата за права заключэння дагавора арэнды. Без спагнання платы за права заключэння дагавораў арэнды будуць прадастаўляцца зямельныя ўчасткі дзяржаўным органам і іншым дзяржаўным арганізацыям; юрыдычным асобам для будаўніцтва і абслугоўвання аб'ектаў нерухомай маёмасці, што знаходзяцца ва ўласнасці дзяржавы; сельскагаспадарчым арганізацыям, у тым ліку сялянскім (фермерскім) гаспадаркам, іншым юрыдычным асобам для вядзення сельскай гаспадаркі і інш.

Праект Кодэкса аб зямлі прадугледжвае магчымасць, а ў шэрагу выпадкаў і неабходнасць правядзення аўкцыёнаў па продажу зямельных участкаў у прыватную ўласнасць грамадзянам Беларусі для індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва. Таксама аўкцыёны будуць праводзіцца на права заключэння дагавораў арэнды зямельных участкаў.

Новы кодэкс прадугледжвае магчымасць прадастаўлення зямельных участкаў для абслугоўвання кожнай кватэры ў блочным жылым доме. Справа ў тым, што дзеючы кодэкс прадугледжвае магчымасць прадастаўлення зямельных участкаў толькі для будаўніцтва і абслугоўвання жылых дамоў. Таму, калі жылы дом з'яўляецца блочным, а кватэры, размешчаныя ў ім, належаць розным асобам, зямельныя ўчасткі для іх абслугоўвання прадастаўляюцца толькі на агульным долевым праве. У сувязі з гэтым многія грамадзяне, якія маюць зарэгістраваныя кватэры ў такіх дамах, сутыкаюцца з праблемай афармлення правоў на займаемыя імі зямельныя ўчасткі з-за таго, што некаторыя з уласнікаў жылога дома адмаўляліся звяртацца за атрыманнем дакументаў, што пацвярджаюць права на долю зямельнага ўчастка.

Узнікаюць у грамадзян і праблемы з афармленнем па спадчыне правоў на зямельныя ўчасткі, калі адзін са спадчыннікаў не жадаў атрымліваць дакумент на зямельны ўчастак. Таму, каб пазбегнуць такіх выпадкаў, праект кодэкса ўстанаўлівае 18-месячны тэрмін з дня адкрыцця спадчыны для звароту ў адпаведныя арганізацыі па афармленне правоў на зямельныя ўчасткі.

Праект Кодэкса аб зямлі дазваляе атрымліваць у спадчыну зямельныя ўчасткі, якія прадастаўлены ў прыватную ўласнасць або пажыццёва спадчыннае валоданне, адначасова грамадзянамі Беларусі і замежнымі грамадзянамі. Гэта будзе адзінай падставай для атрымання ў Беларусі зямельных участкаў ва ўласнасць, пажыццёва спадчыннае валоданне замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства. Гэтыя асобы змогуць перадаваць такія ўчасткі па спадчыне, аднак адчуджаць іх будзе магчыма толькі грамадзянам Беларусі або мясцовым выканаўчым і распарадчым органам.

Дзеючы Кодэкс аб зямлі прадугледжвае прадастаўленне грамадзянам Беларусі зямельных участкаў у прыватную ўласнасць па нарматыўнаму кошту. У новым праекце кодэкса, для больш аб'ектыўнага ўліку якасці зямельных участкаў, — па кадастраваму кошту. Пры гэтым захаваецца магчымасць набыцця грамадзянамі, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, зямельных участкаў у прыватную ўласнасць па льготнай цане. Адначасова вяртаецца страчанае грамадзянамі з 2000 года права набыцця зямельных участкаў па льготнай цане, калі зямельныя ўчасткі былі прадастаўлены ім да 16 чэрвеня 1993 года.

**Сяргей КАРАЛЕВІЧ.**

## Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Віктара Юшчанку з днём нараджэння

**Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў прэзідэнта Украіны Віктара Юшчанку з днём нараджэння.**

Прэзідэнт Беларусі выказаў надзею, што сумеснымі намаганнямі бакі змогуць выкарыстаць бясцэнны патэнцыял беларуска-ўкраінскіх адносінаў, што грунтуюцца на ўзаемаразуменні і даверы, на карысць двух брацкіх народаў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Прэзідэнт Беларусі павіншаваў Аляксія II з днём нараджэння і днём тэзаімянінаў

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Аляксія II з днём нараджэння і днём тэзаімянінаў.**

У віншаванні, у прыватнасці, адзначаецца: «У Беларусі Вас высока цэняць за ўклад у адраджэнне праваслаўных культурных традыцый, маральнае аздараўленне грамадства, глыбока паважаюць за мудрасць і клопаты аб зацвярджэнні ідэалаў міласэрнасці, справядлівасці і дабра». Аляксандр Лукашэнка пажадаў Аляксію II здароўя на доўгія гады, невычэрпных сіл у працы на карысць Праваслаўнай царквы і двух народаў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У ЛАТВІЙСКІМ ІНТЭРНАЦЕ ЗАЖЫВА ЗГАРЭЛІ 25 ІНВАЛІДАЎ

**У латвійскім інтэрнаце для інвалідаў, што ў горадзе Алсунга Браўншвейгскага раёна, у ноч на пятніцу ўзнік моцны пажар. У выніку як мінімум 25 інвалідаў першай і другой групы, якія пакутавалі ад псіхічных захворванняў, загінулі.**

Яшчэ 20 чалавек адшукваюцца паліцыяй. Мяркуецца, што яны маглі напалохацца агню, уцячы на вуліцу і заблудзіцца. На месца здарэння прыбылі міністр дабрабыту Дагнія Стакэ і міністр унутраных спраў Латвіі Івар Годманіс. Прычыны ўзгарання расследуюцца. Паводле папярэдняй версіі пажарных, трагедыя магла адбыцца з-за выкарыстання для абагрэву памяшканняў не прызначаных для гэтага прыбораў. Дарэчы, той ноччу ў Латвіі было да мінус 30 градусаў.

Дзяржсакратар МУС Айвар Страўмэ адзначыў, што, магчыма, гэта самы трагічны пажар у гісторыі Латвіі. Хоць гэта і не першы падобны выпадак у рэспубліцы. У 2003 годзе адзін чалавек загінуў і яшчэ 15 пацярпелі ў выніку пажару ў псіхіятрычнай лячэбніцы ў Даўгаўпілсе.

### КАЛЯ ПОМНІКА ВОІНУ-ВЫЗВАЛІЦЕЛЮ АДБЫЛАСЯ БОЙКА

**Каля помніка Воіну-вызваліцелю ў цэнтры Таліна адбылася бойка, паведамляе DELFI са спасылкай на прадстаўнікоў «Начнога дазору» (арганізацыі, якая абараняе помнік ад вандалаў) і Канстытуцыйнай партыі Эстоніі. Паводле інфармацыі крыніцы, нацыяналісты напалі на ветэранаў, якія прыйшлі ўскласці кветкі да Бронзавага салдата.**

Як стала вядома пазней, каля 20 чалавек, якія прадстаўлялі эстонскае Аб'яднанне нацыяналістаў, паспрабавалі раскідаць кветкі, раскладзеныя ля падножжа помніка, і ўскласці туды вянок з калючага дроту з лентай «Забойцы эстонскага народа». Аднак каля манумента ў гэты час знаходзілася прыблізна 50 рускамоўных жыхароў горада. Адбыўся шэраг патасовак, у якія вымушана была ўмяшацца паліцыя. У выніку нацыяналістам давялося адступіць. У сутыкненнях ніхто не пацярпеў.

### УКРАІНА НЕ ГАТОВА РАЗМЯСЦІЦЬ ІНШАЗЕМНЫЯ ВАЕННЫЯ БАЗЫ, А ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ ЎЖО ВЯДЗЕ АДПАВЕДНЫЯ ПЕРАМОВЫ З ЗША

**Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Тоні Блэр на працягу некалькіх месяцаў вядзе сакрэтныя перамовы з ЗША па размяшчэнню ў краіне амерыканскай сістэмы ПРА, паведамляе The Economist.**

У сваю чаргу, ананімныя крыніцы ў брытанскім урадзе, на якія спасылаецца BBC News, пацвердзілі факт перамоў з ЗША на гэту тэму, адзначыўшы пры гэтым, што Вялікабрытанія не «просіць» размясціць у сябе амерыканскія ракеты-перахватчыкі, але застаецца «адкрытай для прапаноў».

Працяг тэма размяшчэння амерыканскай ПРА атрымала ў заяве прэзідэнта Украіны Віктара Юшчанкі. Ён падкрэсліў, што Украіна не будзе размяшчаць на сваёй тэрыторыі ваенныя базы іншых дзяржаў. З такой заявай прэзідэнт выступіў у эфіры крымскіх тэлеканалаў.

«Украіна, перакананы, і ў будучым не можа быць зацікаўлена, каб на яе тэрыторыі размяшчаліся ваенныя базы любога боку. Тэрыторыя без ваенных баз — гэта лепшы адказ для інтарэсаў Украіны», — падкрэсліў украінскі лідар.

НАБЛЮДАТЕЛЬНЫЙ СОВЕТ ОАО «БЭМЗ»

**ИЗВЕЩАЕТ АКЦИОНЕРОВ**

**о проведении 28 марта 2007 года в 13 часов**
**ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**
**по адресу: г. Брест, ул. Московская, 202, клуб ОАО «БЭМЗ».**

ПОВЕСТКА ДНЯ:

*1. Отчет директора ОАО «БЭМЗ» Разумца С.Л. об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2006 году. Утверждение основных целевых прогнозных показателей социально-экономического развития Общества на 2007 год.*

*2. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе в 2006 году.*

*3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2006 год.*

*4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2006 год.*

*5. Об утверждении распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества, и выплате дивидендов за 2006 год.*

*6. Утверждение направлений использования прибыли, остающейся в распоряжении Общества на 2007 год.*

*7. Об утверждении Устава Общества в новой редакции.*

*8. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.*

*9. Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.*

*10. Об аффилированных лицах Общества.*

**Регистрация участников собрания с 12 часов.**
**Акционерам при себе иметь удостоверение личности, представителям — доверенность.**
***Справки по телефонам: 42-16-83, 42-13-65.***

**Наблюдательный совет ОАО «БЭМЗ».**

**УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «СВІТАНАК»!**

**22 марта 2007 года в 15.00 в актовом зале административно-бытового корпуса состоится**
**ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**
**ОАО «Світанак», расположенного по адресу: г. Жодино, ул. 8 Марта, 1.**

ПОВЕСТКА ДНЯ:

*1. О финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2006 году и основных направлениях деятельности Общества на 2007 год.*

*2. О результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2006 год.*

*3. Утверждение годового бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках Общества.*

*4. О распределении прибыли, остающейся в распоряжении предприятия и выплате дивидендов за 2006 год.*

*5. Утверждение направлений использования прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2007 год.*

*6. Отчет о работе наблюдательного совета в 2006 году.*

*7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.*

*8. Утверждение размера вознаграждений членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.*

*9. Утверждение Устава Общества в новой редакции.*

*10. Предоставление безвозмездной (спонсорской помощи) на 2007 год.*

**С материалами повестки дня можно ознакомиться в библиотеке профкома (ул. 8 Марта, 1) с 15 марта 2007 года.**
***Регистрация участников собрания с 13.00 до 14.50 в день и по месту проведения собрания.***
*Для регистрации при себе иметь: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.*
**Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 1 марта 2007 года.**

ОАО «БЕЛСЕЛЬЭЛЕКТРОСЕТЬСТРОЙ»

**СООБЩАЕТ**

**о проведении 29 марта 2007 года очередного общего собрания акционеров.**

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О порядке ведения собрания.
2. Отчет дирекции о результатах деятельности в 2006 году и задачи на 2007 год.
3. Отчет наблюдательного совета о деятельности в 2006 году.
4. Отчет-заключение ревизионной комиссии по годовому отчету.
5. Утверждение годового баланса Общества за 2006 год.
6. Утверждение размера дивидендов за 2006 год и сроки их выплаты в 2007 году.
7. Утверждение направления использования чистой прибыли в 2007 году.
8. Утверждение в новой редакции Устава Общества.
9. Выборы членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
10. О полномочиях наблюдательного совета.
11. Определения вознаграждения членам выборных органов.
12. О вхождении в состав ГПО «Белэнерго».

***Место проведения: г. Минск, ул. Сухая, 3.***
**Начало в 12 часов.**
*Начало регистрации в 9 часов.*
***Тел. для справок: (017) 226-77-39; 203-63-64; 226-66-47.***
*Для регистрации на собрании акционерам иметь при себе паспорт, представителям акционеров — паспорт и доверенность.*

**Наблюдательный совет ОАО «Белсельэлектросетьстрой».**

белагропромбанк
традиции будущего

**Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» сообщает, что**
**2 МАРТА 2007 ГОДА ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ.**

*Место проведения – 220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.*

**Повестка дня:**

1. Об открытии представительства ОАО «Белагропромбанк» в Итальянской Республике (г. Милан).
2. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Белагропромбанк».

*Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — 23 февраля 2007 года.*

**Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в учреждения ОАО «Белагропромбанк» по месту нахождения акционеров.**

Дата окончания приема бюллетеней для заочного голосования — 28 февраля 2007 года.

*С решениями, принятыми Общим собранием акционеров банка, можно будет ознакомиться в учреждениях ОАО «Белагропромбанк» после 12 марта 2007 года.*

**Телефон для справок: 8(017)2285303.**

*ОАО «Белагропромбанк» сообщает, что с 26.02.2007 на один процентный пункт увеличены процентные ставки по вкладам (депозитам) системы сбережений «Линия роста» в белорусских рублях с плавающими процентными ставками.*

белагропромбанк
традиции будущего

УТВЕРЖДЕНО:
Решение Финансового комитета ОАО «Белагропромбанк» от 19.02.2007 № 15

**ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК» с 26 февраля 2007 г.**

| Сумма депозита, ед. валюты | Вклады (депозиты) с плавающими процентными ставками, % годовых. Срок, дни: 100 | 200 | 300 | 500 | 1 000 | 2 000 | 3 000 | Вклады (депозиты) с фиксированными процентными ставками, % годовых. Срок, дни: 100 | 200 | 300 | 500 | 1 000 | 2 000 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Белорусские рубли** | | | | | | | | | | | | | |
| 1 – 1 000 000 | 10,50 | 11,50 | 13,00 | 14,50 | 15,00 | 15,50 | 16,00 | 7,50 | 7,80 | 8,10 | 8,40 | 8,70 | 9,00 |
| 1 000 001 – 10 000 000 | 11,00 | 12,00 | 13,50 | 14,75 | 15,25 | 15,75 | 16,25 | 7,60 | 7,90 | 8,20 | 8,50 | 8,80 | 9,25 |
| 10 000 001 и более | 11,50 | 12,50 | 14,00 | 15,00 | 15,50 | 16,00 | 16,50 | 7,70 | 8,00 | 8,30 | 8,60 | 8,90 | 9,50 |
| **Доллары США** | | | | | | | | | | | | | |
| 1 – 500 | 4,00 | 5,50 | 7,00 | 8,00 | 8,50 | 9,00 | 9,50 | 4,00 | 5,00 | 6,00 | 6,50 | 7,00 | 7,50 |
| 501 – 5 000 | 4,50 | 6,00 | 7,50 | 8,25 | 8,75 | 9,25 | 9,75 | 4,50 | 5,50 | 6,25 | 6,75 | 7,25 | 7,70 |
| 5 001 и более | 5,00 | 6,50 | 8,00 | 8,50 | 9,00 | 9,50 | 10,00 | 5,00 | 6,00 | 6,50 | 7,00 | 7,50 | 8,00 |
| **Евро** | | | | | | | | | | | | | |
| 1 – 500 | 4,00 | 5,50 | 7,00 | 8,00 | 8,50 | 9,00 | 9,50 | 4,00 | 5,00 | 6,00 | 6,50 | 7,00 | 7,50 |
| 501 – 5 000 | 4,50 | 6,00 | 7,50 | 8,25 | 8,75 | 9,25 | 9,75 | 4,50 | 5,50 | 6,25 | 6,75 | 7,25 | 7,70 |
| 5 001 и более | 5,00 | 6,50 | 8,00 | 8,50 | 9,00 | 9,50 | 10,00 | 5,00 | 6,00 | 6,50 | 7,00 | 7,50 | 8,00 |
| **Российские рубли** | | | | | | | | | | | | | |
| 1 – 15 000 | 5,00 | 6,00 | 7,00 | 8,00 | 9,00 | 10,00 | 10,50 | 5,00 | 5,50 | 6,00 | 6,50 | 7,00 | 8,00 |
| 15 001 – 150 000 | 5,50 | 6,50 | 7,50 | 8,50 | 9,50 | 10,25 | 10,75 | 5,25 | 5,75 | 6,25 | 6,75 | 7,50 | 8,50 |
| 150 001 и более | 6,00 | 7,00 | 8,00 | 9,00 | 10,00 | 10,50 | 11,00 | 5,50 | 6,00 | 6,50 | 7,00 | 8,00 | 9,00 |

**www.belapb.by**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ от 27.10.2006 г. № 2.*

ISSN 1990-763X

**КУРСЫ ВАЛЮТ**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.02.2007 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 142,00 |
| 1 еўра | 2 808,27 |
| 1 латвійскі лат | 3 985,86 |
| 1 літоўскі літ | 813,32 |
| 1 чэшская крона | 99,23 |
| 1 польскі злоты | 723,33 |
| 1 расійскі рубель | 81,61 |
| 1 украінская грыўня | 425,21 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 26,2474 |
| 10 UAH | 51,8467 |
| 1000 BYR | 12,2173 |
| EUR | 34,3920 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 23.02.2007 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2215 / 2325 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

Ліміт авансавых плацяжоў у замежнай валюце або беларускіх рублях, якія праводзяцца без абмежаванняў рэзідэнтам (юрыдычнай асобай або індывідуальным прадпрымальнікам) на карысць аднаго контрагента-нерэзідэнта, зменшыцца з $3 млн да $500 тыс. у эквіваленце.

**БЕЛТА.**

Глядзіце!

# Смех, страх і сэкс як складальнікі шоу

***— Што гэта?***
***— Гэта? 230-ы мерседэс нябеснага колеру...***
***(з к/ф «Дастукацца да нябёсаў»).***

У гэтым выпуску «Зорнага цырка», нарэшце, будзе раскрытая адна з галоўных інтрыг праекту. Не, на жаль, нам не ўдалося даведацца з кампетэнтных крыніц імёны пераможцаў. Але затое стала вядома, за што, уласна кажучы, удзельнікі рэаліці-шоу змагаюцца. Стыльную «ляльку» «Пежо-207» колеру карамелі атрымае... нехта. Адзін з шасці фіналістаў, да вызначэння якіх засталося ўсяго пару тыдняў.

Пакуль жа ў цырку выступаюць 8 герояў — праект па выніках глядацкага галасавання пакінула хатняя гаспадыня Вольга Баранская. За яе паступіў 2321 голас, у той час як сімпатыі да банкіра Юрыя Каштанава выразіліся ў лічбе 7738. (Дарэчы, з гэтага ліку 1200 СМС-паведамленняў за Юрыя даслаў адзін і той жа (!) чалавек — ці то заўзяты прыхільнік, ці то дырэктар банка). Гэтая пара намінантаў, з выступлення якіх па традыцыі пачалося шоу, парадавала публіку паветрана-акрабатычным нумарам на палотнах — зноў жа, па нядаўна ўсталяванай традыцыі, самыя складаныя элементы «палёту» прайшлі без страхоўкі.



Фота Сяргея ЧОРНАГА.

Вольга пакінула шоу прыгожа — з прамой спінай і заявай, што нумар быў падрыхтаваны ад душы, нягледзячы на тое, што трэнеры адмовіліся дапамагаць у ягонай пастаноўцы. Насамрэч выступленне меркавалася зрабіць дзвюма парамі — намінанты і прафесійныя артысты; гэта самі Вольга і Юрый палічылі сябе дастаткова вопытнымі і рызыкоўнымі, каб працаваць самастойна. Юрый Каштанаў, праўда, згладзіў уражанне ад выказванняў напарніцы, падзякаваўшы трэнерам і адміністрацыі «Зорнага цырка». Дый увогуле асабліва засмучаным, нягледзячы на развітанне з больш як сяброўкай па тэлепраекту, банкір не выглядаў — як ён таямніча намякнуў, «хэпі-энд ужо здарыўся, хоць многія, напэўна, аб гэтым яшчэ не здагадваюцца». Вядучы шоу Ягор Хрусталёў намякнуў у адказ, што многім ужо ўсё вядома, прымусіўшы гадаць публіку, ці дачакаемся мы ў фінале праекта рамантычных прызнанняў, ці гэта чарговая гульня рэаліці-шоу. «Галоўнае, — па-філасофску заўважыў старшыня журы, заслужаны артыст Расіі, удзельнік клоунскага дуэта «Мік і Мак» Андрэй Шарнін, — каб артыст проста разняволіўся і атрымліваў задавальненне. Тады і мы ўсе атрымаем задавальненне».

Тэлевядучай Наталлі Радзінай зноў дастаўся нумар з сабачкамі (так і карцела сказаць «Бубу і сабачку маё шанаванне»). Але ў дадатак дзяўчына яшчэ круціла хулахупы — то на ўласным целе, то на трох махнатых памочніках. У выніку, ацэньваючы нумар, член журы Сяргей Журавель тройчы паўтарыў слова «цудоўна» — цудоўная Наташа, цудоўныя сабачкі і ўсё выступленне цудоўнае.

У перапынках паміж выступленнямі Ягор Хрусталёў па звычцы жартаваў — то расказваў анекдоты пра страусаў і Філіпа Кіркорава, то прыгадваў уласныя «ляпы», то пераказваў кароткі змест тэлерэкламы, якая будзе замест паўз у тэлеверсіі: «Скарочана — у яго ёсць гараж, і ён туды ходзіць...».

Перад нумарам Георгія Волчака і Алены Грышанавай з журы некуды знік Аляксандр Ціхановіч. А дарэмна — там было на што паглядзець. Спявачка і артыст-комік у вобразе ці то гурта «Дынаміты», ці то герояў «Зорных войнаў» жанглявалі ўсякімі геаметрычнымі фігурамі — кубам, шарам, плоскім прамавугольнікам.

— Куды Жора пойдзе ў такім выглядзе? — спыталіся вядучыя, маючы на ўвазе экзатычны касцюм і макіяж Воўчака.

— Не ведаю, куды пойдзеце вы, а мы з Ленай пойдзем на Астру — Альфа-Цэнтаўра, — з годнасцю парыраваў артыст.

Дарэчы, пачынаючы з гэтага выступлення ў журы перыядычна «клініла» ноўтбукі — магчыма, у знак пратэсту супраць выстаўленых адзнак? Чамусьці клаунада і жангляж заўжды не падабаюцца журы, ці то падаюцца не такімі адказнымі, ці то занадта простымі... Падобна на тое, што ў пагоні за адказнасцю суддзі і публіка (таксама ў пэўным сэнсе суддзі) забываюцца на першаснае прызначэнне цырка — весяліць, уздымаць настрой.

Вось што хочаце са мной рабіце, а ў Віктара Арцёмава і Паўла Кежы гэта зрабіць атрымалася. Яны ўжыліся ў вобразы Карлсана і домамучыцелькі, якія жывуць... на прыстаўных лесвіцах. Ды яшчэ і агучвалася выступленне тэматычнымі фразамі з любімага мультфільма пра «разумнага, прыгожага, у меру ўпітанага мужчыны ў самым росквіце сіл». Але прафесійнаму клоуну пастаноўка маладых людзей не спадабалася...

— Паша, з чаго вашы грудзі? — прычапіўся да віцебскага настаўніка Хрусталёў.

— Усё натуральнае! — з лёгкай крыўдай запярэчыў Кежа.

Як звычайна, спаборніцтва ў цырку ішло не толькі паміж артыстамі, але і паміж групамі падтрымкі. У банкіра, напрыклад, бралі масавасцю — чатыры рады дасталіся яго балельшчыкам. Сяргей Дарафееў ад імя праграмы «Наша раніца» прывёў цэлы аркестр, які не горш (можа, трошкі цішэй) за цыркавы падтрымліваў адзіную ўдзельніцу — Наталлю Радзіну. За Люсю тупатала, свістала і апладзіравала ці не цэлая рота салдат.

Галоўным «козырам» у будысцкай пастаноўцы Вячаслава Харанэкі стала Вікторыя. На такое імя адгукаецца лама — адна з самых грацыёзных і прыгожых цыркавых жывёлін, якіх мне даводзілася бачыць. Між іншым, ёсць прымета: калі цяжарная жанчына паглядзіць у вочы ламы, дзіця народзіцца прыгожым.

Люся Лушчык пад занавес шоу прадставіла гангстэрскую версію рамантычнай вячэры — акрабатыка на адным століку і чатырох крэслах. Карацей, публіка ў чарговы раз пераканалася — Люся з тых дзяўчат, хто ўмее трымаць мужчын у руках. У літаральным сэнсе.

— Ведаеце, насамрэч, выйсці на публіку ў панчохах і падвязках значна цяжэй, чым утрымліваць партнёра на руках, — прызналася пазней Люся.

Зусім хутка, дарэчы, стартуе цыркавое шоу на адным з расійскіх каналаў. Там, натуральна, будуць гучныя імёны, шыкоўныя дэкарацыі і многа чаго яшчэ з прыстаўкай «супер». А пакуль — глядзім сваё і хварэем за сваіх!

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## «ЛІПА» НЕ ПРАЙШЛА

Пэўна, адхіліцца ад арміі марыў 26-гадовы гамяльчанін, калі прад'явіў паўтара года назад у ваенкамат фальшывую даведку аб тым, што ён з'яўляецца студэнтам стацыянарнай формы навучання адной з расійскіх ВНУ, і гэта давала яму права на адтэрміноўку ад службы ў арміі. Аднак «ліпа» не прайшла, і супраць хлопца ўзбуджана крымінальная справа.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

Прамая лінія

ЗВЯЗДА | Беларускае радыё

# ІЛЬГОТЫ ПАЧАКАЮЦЬ...

**Правам на падатковыя льготы можна скарыстацца пасля 1 сакавіка**

**Лічаныя дні засталіся да завяршэння чарговай кампаніі па дэклараванню сукупнага гадавога даходу. Таму зараз у падатковых інспекцыях сапраўды «гарачыя дні». Як і ў мінулыя гады, падаваць дэкларацыю абавязаны тыя, хто меў некалькі крыніц даходу і такім чынам зарабіў больш за 7 мільёнаў 360 тысяч рублёў, людзі, якія працавалі за мяжой або атрымалі даходы з-за мяжы. Нагадаем, што сёлетняя кампанія раходзіць з адной важнай асаблівасцю: у многіх ёсць магчымасць не толькі выканаць свой абавязак, але і карыстацца льготай і вярнуць з бюджэту пераплачаныя грошы. Перш за ўсё гэта датычыцца тых, хто плаціў за атрыманне адукацыі, купляў або будаваў кватэру. Хто абавязаны падаваць дэкларацыю аб сукупным гадавым даходзе? Якія катэгорыі грамадзян маюць права на падатковыя льготы? — пра гэта і іншае падчас «прамой лініі» Першага Нацыянальнага канала Беларускага радыё ішла размова начальніка ўпраўлення падаткаабкладання грамадзян, дэклaравання даходаў і маёмасці Міністэрства па падатках і зборах Марыны ГРЫГАРЧУК з радыёжурналістам Максімам УГЛЯНІЦАЙ і карэспандэнтам «Звязды».**

**— Марыя Алегаўна, напярэдадні кампаніі вы прагназавалі, што сёлета ў падатковыя інспекцыі прыйдзе каля паўмільёна наведвальнікаў замест традыцыйных 100 тысяч. Наколькі спраўдзіўся такі прагноз?**

— Прагноз спраўдзіўся ў частцы таго, што дэкларацый будзе больш, чым летась. Аднак пакуль, паводле даных на 10 лютага, агульная колькасць дэкларацый у параўнанні з мінулагодняй узрасла ўдвая. Магчыма, увесь вал дэкларацый прыйдзецца на апошні дзень іх падачы, чаго не хацелася б. Да таго ж, дапускаю, што не ўсе людзі яшчэ зразумелі, што яны могуць прыйсці ў падатковую інспекцыю і падаць дэкларацыі, каб скарыстацца сваім правам на льготы. У некаторых абласцях краіны назіраецца большая актыўнасць насельніцтва. Самы вялікі рост дэкларацый у параўнанні з мінулым годам зафіксаваны ў Брэсцкай вобласці, дзе амаль у тры разы вырасла колькасць дэкларацый, у Гродзенскай — у 2,7 раза. Самы маленькі рост у Мінску — у 1,5 раза. Але, я мяркую, што ў сталіцы людзі вырашылі адпачыць да 1 сакавіка, а ў апошні дзень актыўна пойдуць у падатковыя інспекцыі.

**— У якім рэжыме зараз працуюць інспекцыі?**

— Амаль кругласутачна. Усе падатковыя органы рэспублікі працуюць з 8 гадзін раніцы да 20 гадзін вечара, а ў суботу і нядзелю — з 9 раніцы да 15 гадзін. Пасля 1 сакавіка інспекцыі будуць працаваць з 8 раніцы да 19 гадзін вечара, а ў суботу — з 9 раніцы да 13 гадзін.

**— Давайце нагадаем, хто абавязаны падаваць падатковыя дэкларацыі?**

— Падаваць дэкларацыі абавязаны тыя, хто на працягу года атрымліваў даходы з некалькіх крыніц, і іх даход перавысіў 7 мільёнаў 360 тысяч рублёў пры той умове, што яны плацілі на працягу года падатак па агульнай шкале ставак — ад 9 да 30 працэнтаў. Калі не па месцы асноўнай працы фізічныя асобы плацілі стаўку ў 20 працэнтаў, то нават пры наяўнасці і 10 крыніц даходу ім дэкларацыю падаваць не трэба. Я мяркую, гэтым правам — плаціць падаткі па стаўцы 20 працэнтаў не па месцы асноўнай працы — у 2006 годзе скарысталася значная колькасць людзей. Таму ў нас не так хутка расце колькасць дэкларацый. У папярэднія гады, хоць гэта норма існуе ўжо тры гады, такім правам, паводле нашых разлікаў, карысталіся ўсяго некалькі тысяч чалавек. Сёлета — намнога больш.

**— Важна адзначыць, што калі на іншай працы чалавек атрымаў нават 20 тысяч рублёў і не заплаціў падатак па шкале 20 працэнтаў, то гэтыя грошы трэба задэклараваць.**

— Абавязкова, калі сукупны даход больш за 7 мільёнаў 360 тысяч рублёў.

**— А ці трэба падаваць дэкларацыю, калі чалавек атрымаў нейкі падарунак, напрыклад, ад калег па працы?**

— У нас у падаткаабкладанні ёсць тры льготы па падарунках. Калі гэта падарункі, атрыманыя ад блізкіх сваякоў (бацькоў, дзяцей, бабулі, дзядулі, родных братоў, сясцёр, мужа, жонкі, людзей, якія знаходзяцца ў адносінах сваяцтва, напрыклад, блізкія сваякі мужа), то незалежна ад таго, грамадзяне якой краіны гэтыя людзі, на якую суму падарунак, у якім выглядзе — ён не абкладаецца падаткамі. І наогул, любыя даходы ад гэтай катэгорыі грамадзян падаткамі не абкладаюцца. Калі мы вядзём гутарку проста пра падарункі, атрыманыя ад грамадзян Беларусі, то яны не абкладаюцца падаткам, калі ў агульнай суме не перавышаюць за год 500 базавых велічынь — крыху больш за 15 мільёнаў рублёў. Што датычыцца падарункаў ад арганізацый, то яны не абкладаюцца падаткам у межах да 150 базавых велічынь у год — крыху больш за 4,5 мільёна рублёў. Калі падарункі перавышаюць згаданыя межы, тады трэба абавязкова іх дэклараваць і плаціць з іх падаткі.

***(Заканчэнне будзе.)***

***Ігар ШЧУЧЭНКА.***

## Заўтра паэту Алесю ПІСЬМЯНКОВУ споўнілася б 50...



**Калядныя строфы**

**Здароў, марозны, звонкі вечар!**
**Максім БАГДАНОВІЧ**

Я зноў на станцыі лясной,
Марозна-звонкай, заінелай,
Стаю ў Бялынкавічах белых,
Прапахлых смольнаю сасной.

Іскрыцца радасцю зіма,
Не спяць аснежаныя хаты.
О свята светлае Калядаў!
Святлей на свеце свят няма.

А як зіхціць калядны снег,
Як зорка горнецца да зоркі!
«І волен лёгкіх санак бег»
Мне ў іхняй чуецца гаворцы.

І ў гэтай чуйнай цішыні,
Якую лёс яшчэ даў зведаць,
Вялікі грэх не быць паэтам,
Вялікі грэх...

* * *

...А неба, паверце, праясніцца
І сонца нарэшце вернецца.
Я не стану
Ні клясці,
Ні клясціся
Ні ў любові, ні ў вернасці.
Няхай лёкай
Галёкае
Ды над місай
Павісквае.
Ёсць замежжа далёкае,
І замежжа ёсць блізкае.
Мне ж да скону спрадвечнае,
Невымоўнае,
Кроўнае,
Шлях бярозамі мечаны
Ды яшчэ тая рэчанька,
Тая рэчанька, што няпоўная...

* * *

Вада, крынічная вада.
Відаць, пілі такую продкі.
Вось гэтак прагна і салодка —
Аж забывалася бяда.

І коней кінуўшы на ўзмежку,
Упаўшы ў пахкую траву,
Пілі з даверлівай усмешкай
Нябёс густую сіняву.

Гулі натруджаныя рукі,
І думкі-воблакі плылі,
А можа, мроіліся ўнукі,
Што іх паўтораць на зямлі.

І ліхадзеям на здзіўленне,
Ўратуюць мовы спеўны лад,
Сваё крынічнае сумленне
І свой падсінены пагляд.

* * *

Восень.
Пагодзіна.
Горкі.
Цэдзіць святло маладзік.
Тут па былінных пагорках
Калісьці
Гарэцкі
хадзіў.
Гэтак жа падалі зоркі,
Антонаўкі спелі ў садах.
Пахла бульбоўнікам горкім,
Калі ён
пра долю
гадаў.
Спеліў шчымлівае слова,
Каб праўдаю высвеціць сказ,
Каб слова
дыхнула
жытнёва
І нам
растлумачыла
нас.

* * *

І вёдры, поўныя вады,
І вочы, поўныя дабра.
Гляджу на матчыны сляды
На белай посцілцы двара.

Я з гэтай чуйнай цішыні,
Што лёс паслаў, як дар,
Гляджу ў былыя дні —
Гадоў гартаю каляндар.

Я іх гартаю без жальбы,
Лічу ад першага вянца.
Нічога нельга мне забыць —
Усё мне несці да канца.

З табою несці праз гады
Ад белай посцілкі двара
І вёдры, поўныя вады,
І вочы, поўныя дабра.

**Вячэра**

*Эскіз з натуры*

Агонь у печы дагарае.
Булькоча бульба ў чыгуне.
Сівая ўвішная старая.
І два святыя на сцяне.
Святых завуць Пятрок і Павел.
Ды — я. Ды кот-вуркот на лаве.
О, дух сялянскага жытла!
Маё маленства гэтак пахла...
Мяне, Пятра і Паўла
Старая просіць да стала:
— Сядайце, хлопцы,
бульба стыне...

**Азяблай**

Куды спяшаеш,
Як жывеш,
Як ладзіш з лёсам?
Я запрашу цябе
У верш,
Азяблую,
З марозу.
Ты мне сняжынку прынясеш
На доўгіх веях.
Ты прынясеш
Мне свой мяцеж,
Пазычаны ў завеі.
Ён не дае табе старэць,
З ім верш не састарэе...
Заходзь далоні грэць
Над полымем харэю.

**Кастусь і Марыся**

Не сумуй,
не сумуй,
Беларусь,
Па-над крыўдай сваёй узніміся.
Імя слаўнае ўспомні Кастусь
І адданыя
Вочы Марысі.
Белавежжа паслухай лясы.
У іх пошуме ратныя былі.
Гэта вояў тваіх галасы.
Іх забілі,
Але не забылі.
Брукаванкаю Вільні іду,
Там,
Дзе нашыя сны не збыліся.
І аб вечным гамонку вяду
З Кастусём і Марысяй,
З Кастусём і Марысяй...

**Падрыхтавала Алена ПІСЬМЯНКОВА.**

# Дзівакамі былі геніі

*Мой прадзед быў скрыпач —*
*Ён выкрасаў і смех, і плач.*
*А дзед у пчолах ведаў толк,*
*Як сёння рэдка знае хто.*
*І ў бацькі рэдкі дар —*
*Сваёй зямлі ён гаспадар.*
*А я — ні граць, ані — араць,*
*Хоць крычма закрычы!*
*Каб існаванне апраўдаць,*
*Я вершы крэмзаю ўначы.*
*Я расказаць хачу пра род,*
*Пра вечны клопат на сяўбе...*
*Пра іх пішу каторы год,*
*Пра іх і пра сябе.*

*«Замест аўтабіяграфіі».*
*З кнігі «Я не памру, пакуль люблю».*

Паэтычны вобраз, які ствараў Алесь Пісьмянкоў у беларускай паэзіі, у асноўным, як мне здаецца, складаецца з трох Прынцыпаў (Тройца ў Адзінстве) — *Першароднай чысціні, Саннага следу і Завяршэння* (падсумоўвання таго, што зроблена). Памятаю, аднойчы я сказаў, што яго паэзія, яго вершы (зараз можна сцвярджаць, што кожны) напамінаюць мне пачатак любой работы, яе працэс і заканчэнне («альфа і амега» — пачатак і канец). Хоць Пісьмянкоў адмоўна ставіўся да пэўных крытычных схем творчасці паэтаў (пра гэта я прачытаў у яго рукапісных літаратурна-сентыментальных падарожжах), я ўсё ж адважыўся і для большай нагляднасці прадэманстраваў яму (гэта было ў Горках, калі мы ездзілі да пісьменніка Уладзіміра Ліўшыца) забіванне цвіка ў дошку. Я разумеў, што прымітыўна тлумачу паэтычныя прынцыпы, тым не менш пасля апошняга майго ўдару малатком па плешцы цвіка я сказаў, што сваю работу закончыў так, як ён у вершы абагульніў створаны вобраз апошнім радком.

Пісьмянкоў зацягнуўся цыгарэтай, паварушыў рыжаватымі вусамі і згадзіўся:

— Безумоўна, так. Але ж для мяне арыенцірам, шляхам, калі хочаш, законам *Нараджэння, Прадумвання* і канчатковага *Запісу* вершаў былі і застаюцца класічныя радкі Аркадзя Куляшова:

*...І ёсць адказнасць*
*перад строгім вершам,*
*Перад яго пачаткам і канцом —*
*Каб баразну,*
*радком пачаўшы першым,*
*У сноп звязаць*
*шаснаццатым радком.*

Сапраўды, Алесь Пісьмянкоў, як прыкладны, удзячны вучань, прытрымліваўся прынцыпу своеасаблівай куляшоўскай «вязкі» вершаў. Ён насіў у сабе класічныя радкі паэта і ніколі пра іх не забываў: «...Шаснаццаць сцежак на лістку паперы // Як спраў працяг, якія я люблю, // Шаснаццаць крокаў, каб ісці наперад, // Шаснаццаць рук, каб абдымаць зямлю».

Што сабой уяўляе такое пісьмо? Для мяне яно (спадзяюся, што і для многіх) зразумелае і вельмі прынаднае, бо ўспрымаю яго душой, адчуваю сэрцам. Яно, як я ўжо сказаў, складаецца з трох прынцыпаў: Першароднай Чысціні, Саннага следу і Завяршэння.

***Прынцып Першароднай Чысціні***

Яго я ўспрымаю на ўзроўні ўзаемаадносінаў маці і нованароджанага дзіцяці. Няма больш шчырых, сардэчных, цёплых, чыстых узаемаадносінаў паміж людзьмі (і не толькі), як паміж гэтымі дзвюма асобамі. Прычым, заўважце, дзіця не можа сказаць, чаго хоча, чаму плача, што яму баліць, але ж маці адчувае немаўля, як саму сябе.

***Прынцып Саннага следу***

Кожны наш рух, учынак, слова — пакідае след. Ён не ўтвараецца сам па сабе, без кроку наперад. Рухацца, ісці па саннай, зімовай дарозе, у два, а то і ў некалькі разоў цяжэй, чым ступаць па дарозе ўлетку. Зімовая дарога загартоўвае дух, цвярозіць розум, прымушае спярша думаць, а потым ужо дзейнічаць.

***Прынцып Завяршэння***

Любую распачатую справу (напрыклад, узараць кавалак зямлі, падсілкавацца, прачытаць апавяданне і г.д.) трэба завяршаць. Не зробіш — будзеш ісці па крузе, пакуль не закончыш работу.

Завяршэнне — вянок працы, яе спазнанне, накапленне мудрасці.

Таму і атрымліваецца, што кожны першы вершаваны радок Алеся Пісьмянкова — гэта зерне, укінутае ў зямлю. Наступныя радкі — каласкі, якія спеюць у залежнасці ад урадлівасці зямлі, яе апрацоўкі, надвор'я і гэтак далей. А канцавы радок — ужо выспелы каласок, які гатовы для ўжывання.

Паэт, як руплівая жняя, збіраў іх разам у страфу альбо ў слупок-снапок, потым некалькі гэткіх слупкоў-снапкоў і склалі яго вершы.

Вяртаючыся да першароднасці, пачынаеш разумець думку Паэта пра паняцце *Чыстай* (белай) *красы*.

«Вечныя пытанні (жыццё і смерць, каханне і г.д.), — прызнаваўся Алесь Пісьмянкоў, — заўсёды былі і будуць аб'ектам паэзіі. Урэшце, гэта і складае прыроду праўдзівай лірыкі, а яна, як вядома, стварае і развівае характар, непасрэдна звязаны з унутраным светам і духоўным жыццём аўтара. Так што ў любым выпадку мы маем справу з Чалавекам».

Я даволі часта прыглядаўся да Пісьмянкова-Чалавека. У той час, калі большасць думала пра тое, каб зарабіць, урэшце, «набіць» кішэню грашыма, ён днямі і начамі думаў вершы. Канешне, пры гэтым ён працаваў, зарабляў, карміў і расціў двух сыноў, але ж большую частку жыцця, калі не лічыць кароткіх летуценных сноў, аддаваў працы над вершамі. Гледзячы іншы раз на яго, мне станавілася балюча і крыўдна. Крыўдна ад таго, што Чалавек, які штодня гаварыў з Небам, а такіх сярод нас адзінкі, вершы якога акрыляюць і натхняюць на добрае і светлае, на радаснае і шчаслівае, вымушаны быў без усялякіх ільгот, нараўне з усімі змагацца за жыццё.

Палёгкі, як вядома, ён не шукаў. Караскаўся, як мог. Не плакаў і не прасіў дапамогі. Толькі часта закурваў, і тады, у тыя хвіліны думнага маўчання, з вачэй, як ніколі, выпраменьвалася туга па чыстым, светлым, белым...

Паслухаеш іншы раз яго пра жыццё-быццё і прызнаешся: «Дзівак, чалавек!» Але ж...

*З дзівакоў не смейцеся,*
*Лепш дзівакам зайздросьце,*
*Што самі не ўмееце*
*Жыць*
*як яны, —*
*проста.*
*Пошасцю не пужайце*
*Іх, з чысцінёй заручаных,*
*Іроніяй іх не джальце —*
*Смехам*
*сваім*
*атручаным.*
*Не забівайце жартамі:*
*Добрых з гадамі менее!*
*Не дабівайце жалем:*
*Дзівакамі*
*былі*
*геніі...*

**Віктар ПАТАПЕНКА.**
**(З кнігі «Шлях бярозамі значаны»)**

***Памяці Алеся Пісьмянкова***

**Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ**

Ты адтуль не напішаш
І не зробіш званка...
Вечны холад і ціша
Да майго сябрука.

І царкоўныя свечкі
Зноў становяцца ў рад
І кіруюцца ў вечнасць,
І ніколі — назад.

Праплылі аблачынай
Твае мары і сны.
Засталася Айчына,
Засталіся сыны.

І напоўнюся верай,
Што не спыніцца час,
Што заўжды будуць вершы,
*Што ты думаў для нас.*

## «Канадцы» ў «Белавія»

**Учора ў Нацыянальным аэрапорце прызямліўся першы пасажырскі самалёт CRJ-100 канадскай вытворчасці — фірмы «Бамбардз'е». Яго ў лізінг набыла наша кампанія «Белавія».**

Паводле слоў яе гендырэктара Анатоля ГУСАРАВА, мяркуецца набыць у бліжэйшы час яшчэ некалькі самалётаў рэгіянальнага класа. Самалёты CRJ-100 паступова заменяць паветраныя караблі расійскай вытворчасці. У асноўным ТУ-134 і ТУ-154, у якіх праз некалькі гадоў заканчваецца рэсурс эксплуатацыі. Ім на змену прыйдуць эканамічныя і больш камфортныя самалёты замежнай вытворчасці, выкарыстанне якіх дазволіць абысціся без рэзкага павышэння цэн на авіябілеты па такіх папулярных накірунках, як Масква, Кіеў, Варшава, Калінінград, Берлін, Прага і г.д. Усяго сёлета мяркуецца набыць тры «канадцы», кожны з якіх разлічаны на перавозку 50 пасажыраў на сярэднія адлегласці. CRJ-100 будуць у асноўным лятаць там, дзе ёсць неабходнасць перавозіць адносна невялікую колькасць пасажыраў з большай частатой палётаў: 3—4 разы ў суткі. Беларускія экіпажы лётчыкаў для CRJ-100 былі падрыхтаваны ў адным з вучэбных авіяцэнтраў Францыі.

**Леанід ТУГАРЫН.**

**ОАО «МИНСКТОРГМАШ» сообщает о проведении очередного общего собрания акционеров, которое состоится 29 марта 2007 г. в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, 22, бухгалтерия Общества.**

**Повестка дня:**

- Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2006 г.
- Отчет ревизора.
- Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибыли и убытках Общества.
- О выплате дивидендов за 2006 г.
- О проекте распределения чистой прибыли на 2007 г.
- Об избрании членов наблюдательного совета и ревизора.
- Об установлении вознаграждения для членов наблюдательного совета и ревизора.
- О внесении изменений в Устав Общества.

**Регистрация начинается в 13.30. При себе иметь паспорт.**

**Наблюдательный совет.**

## Квоты на імпарт тытунёвых вырабаў адменяць?

У Беларусі разглядаецца магчымасць адмены квот на імпарт тытунёвых вырабаў, паведамілі ў Міністэрстве гандлю Беларусі.

У ведамстве растлумачылі, што Мінгандаль ужо падрыхтаваў і ўнёс у Савет Міністраў адпаведныя праекты нарматыўна-прававых актаў, якія прадугледжваюць адмену кватавання адносна ўвозу тытунёвых вырабаў. Гэта рашэнне стане адным з крокаў па рэалізацыі міжурадавага беларуска-расійскага пагаднення па развіццю гандлёва-эканамічных адносінаў, якое рыхтуецца да падпісання ўрадамі абедзвюх краін.

**БЕЛТА.**

## У Беларусі сярэдняя заработная плата работнікаў у студзені склала Br617 тыс. 244

**Налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Рэспублікі Беларусь у студзені гэтага года склала Br617 тыс. 244, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу. Гэты паказчык у снежні 2006 года быў Br668 тыс. 49.**

Налічаная сярэдняя заработная плата рабочых і служачых склала ў снежні гэтага года Br636 тыс. 739 (у снежні мінулага года яна была Br688 тыс. 621).

**БЕЛТА.**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ДАПАМАЖЫ САБЕ САМ

## Не пакідайце ангіне шанцаў!

**Мабыць, не знойдзецца чалавека, які хоць раз не хварэў на ангіну (нездарма медыкі адносяць яе да ліку найбольш распаўсюджаных інфекцыйных захворванняў). Звычайна пачынае крыху балець горла, потым боль узмацняецца, ды так, што глытаць цяжка, увечары падымаецца тэмпература і з'яўляецца агіднае адчуванне разбітасці.**

«Падхапіць» ангіну можна як паветрана-кропельным шляхам, так і праз ежу. Акрамя таго, трэба памятаць, што ад хранічнага запалення ў поласці рота ці носа (карыёзныя зубы, гнойнае запаленне прыдатачных пазух носа і г.д.) да ангіны — адзін крок. Верагоднасць узнікнення ангіны павялічваюць і пераахаладжэнні,ператамленні, псіхічныя напружанні, авітаміноз.

### Нанясіце ўдар у адказ!

Пры першых прыметах ангіны тэрмінова пачынайце актыўна лячыцца: палашчыце горла, піце настоі траў, рабіце інгаляцыі, масіруйце рэфлексагенныя кропкі — словам, задзейнічайце ўвесь «проціангінны» арсенал.

### Паласканні і інгаляцыі

Для паласкання горла (а рабіць гэта трэба кожную гадзіну) скарыстайце такі настой:

■ вазьміце па 3 ст. лыжкі лісця мяты і пладоў шыпшыны, па 1 ст. лыжцы святаянніку, каранёў крапівы, усё перамяшайце. Сталовую лыжку сумесі заліце шклянкай кіпеню, настойвайце гадзіну, працадзіце.

Гэты збор можна і піць у цёплым стане пасля яды і перад сном, а на ноч зрабіць з яго інгаляцыю.

Калі травяныя паласканні не даюць чаканага выніку, паспрабуйце іншыя сродкі.



■ Адцісніце сок з лісця каланхоэ, развядзіце яго цёплай вадой у прапорцыі 1:1 і палашчыце горла некалькі разоў на дзень. Дарэчы, лісце гэтай лекавай расліны можна проста жаваць.

■ Змяшайце 1/2 шк. соку альясу і 1/2 шк. цукру, настойвайце 4 гадзіны, дадайце шклянку гарэлкі, настойвайце яшчэ суткі, працадзіце. Піце атрыманы салодка-горкі лікёр па 1 ст. лыжцы тры разы на дзень перад ядой.

Добры эфект дае і змазванне міндалін піхтавым маслам, толькі не рабіце гэтага перад паласканнем горла. Будзеце рабіць інгаляцыю, капніце 3—4 каплі масла ў травяны адвар, карысці будзе больш.

Жуйце некалькі разоў на дзень невялікія кавалачкі кораня аеру. Не падабаецца аер — замяніце яго прапалісам: рэчывы, што змяшчаюцца ў ім, забіваюць любую заразу. І яшчэ: штодня з'ядайце апельсін, мандарын, грэйпфрут ці лімон з мёдам або цукрам.

***Ангіна — вельмі небяспечнае захворванне. Яна паражае ўвесь арганізм. Гной, што назапашваецца на міндалінах, паступова трапляе ў кроў, якая разносіць яго па ўсяму арганізму (адсюль агульная слабасць, ламота ў суставах, галавакружэнне, пачашчанае сэрцабіццё). Таму калі ў вас нават няма тэмпературы, строга трымайцеся пасцельнага рэжыму. Перанесеная на нагах ангіна ў 2—3 разы павялічвае рызыку развіцця цяжкіх ускладненняў з боку сэрца, нырак і суставаў.***



ДЛЯ ВАШАЙ КАРЫСЦІ

## «А навошта табе есці суп?»

**Памятаеце, гэтае пытанне задае малая гарэза маме ў рэкламе. У адказ яна чуе: «Таму што ён смачны і карысны». І гэта сапраўды так (і нават без «Галіны Бланкі»). На жаль, сёння супы — не ў модзе. Фаст-фуд (хуткае харчаванне) кіруе светам. А ўсё таму, што ў многіх з нас няма часу на нармальны абед.**

Шкада, бо суп нашаму арганізму жыццёва неабходны. Асабліва ў халодную пару года. Ён дае энергію і цяпло, актывізуе абмен рэчываў і кровазварот, аднаўляе баланс вадкасці, ад якога залежыць узровень артэрыяльнага ціску. У суме многа вітамінаў і каштоўных мінералаў (пры ўмове, што ён правільна прыгатаваны. Аб гэтым — крыху ніжэй). Гэта выдатная прафілактыка гастрыту.

Есці суп можна як на абед, так і на вячэру, асабліва тым, хто марыць пахудзець. Дыетолагі прыйшлі да высновы, што большасць уладальніц стройнай фігуры — прыхільніцы першых страў. Справа ў тым, што на іх пераўтраўліванне наш арганізм затрачвае намнога больш кілакалорый, чым змяшчаецца ў самой страве. Дарэчы, у талерцы поснага супу прыкладна 40 ккал., а ў звараным на мясным булёне ўсяго 75—100 ккал. Вегетарыянскія супы падтрымліваюць карысную мікрафлору ў кішэчніку, нармалізуюць яго маторыку. Асабліва карысныя супы з крупамі, якія багатыя на харчовыя валокны. Пекціны выводзяць з кішэчніка таксіны, солі цяжкіх металаў, а клятчатка перашкаджае ўсмоктванню ў кроў шкоднага халестэрыну.

### Сакрэты кулінараў

**Існуюць пэўныя сакрэты прыгатавання смачнага і, галоўнае, карыснага супу.**

■ Гатуйце булён у каструлі з закрытай накрыўкай. Давядзіце ваду да кіпення, а затым паменшыце агонь і прыадкрыйце накрыўку.

■ Ялавічныя косці лепш рассячы, каб з іх выдзеліліся пажыўныя рэчывы.



■ Курыны булён атрымаецца больш смачным, калі ў яго перад гатаваннем пакласці 1—2 абсмажаныя курыныя костачкі.

■ Саліце: мясны булён за паўгадзіны да гатоўнасці, рыбны — у пачатку гатавання, грыбны — у самым канцы гатавання.

■ Ніколі не пакідайце ў гатовым супе лаўровы ліст! Ён дае пах пры гатаванні, а потым толькі псуе смак. Дробна парэзаны часнок дадавайце толькі пасля таго, як суп будзе гатовы. Вялікая колькасць морквы зробіць суп салодкім.

ПОСНЫ СТОЛ

## Грыбны суп з агароднінай

**250 г свежых або 30—40 г сушаных грыбоў, 1 л вады, 1 цыбуліна, 1 корань пятрушкі, 1 морквіна, 1/4 невялікага качана капусты, 4—5 бульбін, алей, соль, перац, 1/2 салёнага агурка, зяленіва.**

Падрыхтаваныя грыбы дробна парэжце і тушыце ў невялікай колькасці алею разам з парэзанай цыбуляй, пятрушкай і морквай да гатоўнасці. Бульбу і капусту апусціце ў кіпень, адварыце да паўгатоўнасці, затым дадайце тушаныя грыбы і прыправы, усё гатуйце яшчэ 10 хвілін. Незадоўга да канца гатавання пакладзіце нарэзаны лустачкамі агурок. Пры падачы на стол суп пасыпце зяленівам.



**ОАО «БЕЛГАЛАНТЕРЕЯ»**
**извещает своих акционеров о проведении 28 марта 2007 года очередного собрания акционеров**

**Повестка дня:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2006 год и основных направлениях развития ОАО «Белгалантерея» на 2007 год.
2. О заключении ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности Общества за 2006 год.
3. Утверждение годового баланса и отчета о прибылях и убытках ОАО «Белгалантерея» за 2006 год.
4. Об утверждении направлений использования чистой прибыли в 2007 году и выплаты дивидендов.
5. Утверждение мероприятий по обеспечению стабильной работы Общества в 2007 году.
6. Утверждение условий материального вознаграждения членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
7. Избрание членов наблюдательного совета.
8. Избрание членов ревизионной комиссии.
9. Утверждение новой редакции Устава ОАО «Белгалантерея».
10. Об оказании спонсорской помощи в 2007 году.
11. Утверждение переоценки основных средств индексным методом.

**Место проведения собрания:** г. Минск, ул. Ботаническая, 5а, актовый зал, 6-й этаж.

**Время начала проведения собрания — 14.00.**

**Время регистрации участников собрания** — в день проведения собрания с 13.00 до 13.45 по предъявлению документа, удостоверяющего личность, а представителям акционеров — по доверенности.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания — в рабочие дни, начиная с 10 марта 2007 года по месту нахождения Общества, в день проведения — по месту проведения собрания.

**ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ»**
**сообщает, что 29 марта 2007 года в актовом зале предприятия — ул. Пономаренко, 43, в 16.00 состоится собрание акционеров.**

**Повестка дня:**

1. Отчет наблюдательного совета за 2006 год.
2. Об итогах работы Общества за 2006 год и перспективах работы Общества на 2007 год.
3. Утверждение отчета ревизионной комиссии, бухгалтерского баланса, отчета о прибыли и убытках за 2006 год.
4. Об утверждении дивидендов за 2006 год.
5. Установление нормативов направления использования чистой прибыли на 2007 год.
6. Утверждение новой редакции Устава Общества.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества и определение условий их оплаты.

О наделении наблюдательного совета некоторыми полномочиями, отнесенными к компетенции общего собрания акционеров Общества.

**Регистрация акционеров будет производиться в актовом зале предприятия с 15.00 до 15.45.**

При себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — нотариально заверенную доверенность).

**Администрация.**

**Калектыў «Звязды» выказвае шчырыя спачуванні супрацоўніку рэдакцыі Аляксандру АСІПЕНКУ з сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

# ПАДУМАЙЦЕ ПРА ЛЕТНІ РАМОНТ СВАІХ ЦЕПЛАСЕТАК УЖО СЁННЯ

## Да гэтага заклікаюць сваіх цяперашніх і патэнцыяльных партнёраў на сумесным прадпрыемстве «Бел-Ізаліт»

**Аднак адносна сутнасці заклiку — крыху ніжэй, а спачатку нагадаем, што сабой уяўляе «Бел-Ізаліт». Гэта — сумеснае беларуска-нямецкае прадпрыемства, заснавальнікам якога з беларускага боку з'яўляецца Мінгарвыканкам. Заснавана яно, адпаведна, па ініцыятыве Мінгарвыканкама, а таксама Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі ў 1996 годзе, размешчана ў прамысловай зоне «Шабаны» ў свабоднай эканамічнай зоне «Мінск». Асноўная прадукцыя «Бел-Ізаліта» — папярэдне тэрмаізаляваныя трубы, якія служаць для пракладкі цеплавых трас. Чым вызначаюцца гэтыя трубы і адпаведная тэхналогія?**



Пачнём з таго, што нашы традыцыйныя цеплатрасы, або цеплатрасы, якія былі ўзведзены раней (пры гэтым металічная труба хавалася ў груваcткі жалезабетонны канал, які загадзя трэба было выкласці ў земляной траншэі, загортвалася ў мінеральную вату) мелі (і маюць) вялікую здольнасць страчваць цяпло. Гэтыя страты даходзяць да 40 працэнтаў. А губляць столькі цяпла ўвогуле недаравальна, і асабліва цяпер, калі перад намі, як ніколі востра, паўстала пытанне энергазберажэння.

І гэта яшчэ не ўсё. Як сведчаць спецыялісты, больш-менш надзейны тэрмін службы «традыцыйнай» трубы, нягледзячы на ўсялякія абгортванні, складае 10—15 гадоў. Вось таму мы і з'яўляемся даволі частымі сведкамі раскопак на вуліцах нашых гарадоў.

Папярэдне ізаляваная труба (ПІ-труба), паводле выказванняў спецыялістаў, уяўляе сабой гэткі сэндвіч, які рыхтуецца наступным чынам: металічная труба ўстаўляецца ў поліэтыленавую — міліметраў на 100 большую па дыяметру, а свабодная прастора паміж імі запеньваецца поліурэтанам. Прычым поліурэтан наглуха схоплівае абедзве трубы паміж сабой, утвараючы жорсткую канструкцыю. Атрыманы «сэндвіч» і ўкладваецца непасрэдна ў земляную траншэю. А цяпер самае галоўнае: у цеплатрасе, пракладзенай з папярэдне ізаляваных труб па дарозе да спажыўца губляецца ўсяго 2—5 працэнтаў цяпла. Параўнаем з 40 працэнтамі традыцыйнай трубы.

Летась прадпрыемства «Бел-Ізаліт» адзначыла свой 10-гадовы юбілей.

— «Бел-Ізаліт» першым прыйшоў на айчынны рынак з адзначанай тэхналогіяй, спецыялісты прадпрыемства шмат зрабілі па папулярызацыі гэтай тэхналогіі, — падкрэслівае яго генеральны дырэктар Святаслаў Абражэвіч. — Самае галоўнае, што нясе з сабой гэта тэхналогія, — эканомію энергарэсурсаў. Выключна гэта тэхналогія прымяняецца ў еўрапейскіх краінах, знаходзіць шырокае распаўсюджванне ў Расіі і іншых постсавецкіх краінах. У мінулым годзе мы асвоілі выпуск ПІ-труб вялікага дыяметра, у якіх дыяметр металічнай трубы складае 700—800 міліметраў. Гэта дае нам магчымасць цалкам задавальняць патрэбнасці вялікай энергетыкі (тут у першую чаргу маецца на ўвазе пракладванне адрэзкаў цеплатрас, што бяруць свой пачатак непасрэдна ад цеплаэлектрастанцый)... «Бел-Ізаліт» стаў надзейным партнёрам для прадпрыемстваў, якія працуюць у галіне цеплаэнергазабеспячэння, для жыллёва-камунальных і будаўнічых арганізацый. Яны ў выніку эканомяць і сродкі, і час. Напрыклад, сумарныя затраты на ўзвядзенне і эксплуатацыю цеплатрас з ПІ-труб за 30 гадоў іх праектнай службы, у параўнанні з ранейшай тэхналогіяй, меншыя ў 6 разоў...





Да слоў Святаслава Іванавіча варта дадаць: гэта тэхналогія, пры ўсіх яе плюсах, мае таксама на ўвазе аснашчэнне цеплатрас з ПІ-труб спецыяльнай кантрольнай сістэмай, якая можа з дакладнасцю да метра ўказаць месца нават самага нязначнага выхаду цепланосьбіту з трубы. Вядома, калі такое здарыцца. А здарыцца такому не можа дазволіць уся сістэма надзвычай строгага кантролю як непасрэдна ў вытворчасці ПІ-труб, так і на мантажы цеплатрас. Пры гэтым пры «Бел-Ізаліце» створана таксама прадпрыемства «Бел-Ізаліт-Мантаж», якое ў нярэдкіх выпадках само ж і ўзводзіць адпаведныя цеплатрасы. Яшчэ раней сістэма кіравання якасцю «Бел-Ізаліта» была атэставана на яе адпаведнасць міжнародным стандартам ISO 9001, у мінулым годзе адпаведны сертыфікат атрымаў чарговае пацвярджэнне.

Аднак пазнаёмімся яшчэ з адным Святаславам Абражэвічам — начальнікам цэха. Прычым адразу ж зазначым: гэта тая «сямейнасць», якая справе ніколькі не шкодзіць, а, наадварот, толькі дапамагае. Напрыклад, варта было паглядзець, як ушчуваў рабочых маладзейшы Святаслаў Абражэвіч за трохі вы пушчаную імі на падлогу поліурэтанавую пену падчас заліўкі трубы: «Грошай жа каштуе»... Малады Святаслаў Абражэвіч яшчэ некалькі гадоў таму хадзіў у мора на гандлёвым флоце. Потым прыехаў у Мінск, ды і надзейна кінуў якар на «Бел-Ізаліце», на якім, як зазначыў ён сам, ніколькі не горш. Пачынаў тут слесарам, потым быў інжынерам па якасці, а летась прызначаны начальнікам цэха. Сёлета заканчвае БНТУ, факультэт цеплаэнергетыкі, літаральна праз тыдзень у яго дзяржаўны экзамен, дыпломны праект, вядома ж, — па «тэме»: вытворчасць тэрмаізаляцыйных трубаправодаў.

Малады Абражэвіч паказвае ўстаноўку, на якой можна працаваць з поліэтыленавымі трубамі вялікіх дыяметраў, а таксама аўтамат для зварвання вялікіх дыяметраў — набыты ў мінулым годзе. Якраз набыццё гэтага абсталявання і дазваляе цяпер «Бел-Ізаліту» папоўніць асартымент сваёй прадукцыі вялікімі ПІ-трубамі... Падчас нашай размовы Святаслаў Абражэвіч адзначыў добрую якасць поліэтыленавых труб Барысаўскага завода пластмасавых вырабаў; шкада толькі, што на ім не выпускаюцца трубы менавіта вялікіх дыяметраў, апошнія даводзіцца завозіць з-за межаў Беларусі... Дарэчы, імпартаваць «Бел-Ізаліту» даводзіцца нямала чаго (з Расіі, Германіі, Украіны), а ў цэлым кошт матэрыялаў для вытворчасці ПІ-труб складае каля 70 працэнтаў ад кошту заказу.





Леанід Зубкоўскі — намеснік генеральнага дырэктара па маркетынгу, яго асноўны клопат, — зразумела, камплектаванне партфеля тых жа заказаў. Сёлета справа з імі выглядае больш-менш добра. Цяпер «Бел-Ізаліт» выконвае неблагі заказ на даволі значную суму, для Брэстэнерга. «Бел-Ізаліт» таксама выйграў тэндар на пастаўку сваіх ПІ-труб (820 мм) для мінскіх метрабудаўцаў. Прычым менавіта гэты заказ стаў для прадпрыемства першым заказам на трубы вялікага дыяметра, да выпуску якіх, як сказана ўжо, тут добра падрыхтаваліся яшчэ ў мінулым годзе.

— Гэта, аднак, цяпер справа з заказамі складваецца, як быццам, нядрэнна. А бывае так, што ўся наша работа хутчэй набывае гэткі сезонны характар, — скардзіцца Леанід Зубкоўскі на зімовую спячку патэнцыяльных заказчыкаў. — Прадпрыемствы, пачынаючы з лістапада і па май, як правіла, загружана слаба. Затое ў летні перыяд даводзіцца арганізоўваць нават трэцюю змену або кругласутачную, практычна бесперапынную работу. Адсюль цяжкасці з камплектаваннем штату. На летні перыяд даводзіцца нямала набіраць дадатковых людзей. Пры гэтым нярэдка выручаюць студэнты, якія прыходзяць да нас летам зарабіць...

Менавіта Леанід Зубкоўскі і заклікае заказчыкаў падумаць пра летні рамонт сваіх цепласетак ужо цяпер. Гэта дазволіла б і прадпрыемству лепей спланаваць сваю работу, працаваць больш рытмічна, а значыць — і больш якасна, і належным чынам падрыхтавацца да летняга сезона таму ж заказчыку, атрымаць ад прадпрыемства ўсё неабходнае ў дакладна вызначаны тэрмін. А пры гэтым варта ўдакладніць: вырабляюць на «Бел-Ізаліце» не толькі папярэдне ізаляваныя трубы, а і ўсе фасонныя элементы, якія выкарыстоўваюцца пры пракладванні цеплатрас, — пераходныя часткі трубаправодаў, трайнікі і г.д.

Сёння на «Бел-Ізаліце» за год здольныя забяспечыць патрэбы заказчыкаў у трубах і фасонных элементах цеплатрас працягласцю гэтых цеплатрас больш за 100 кіламетраў. Пры гэтым на «Бел-Ізаліце» падкрэсліваюць: вельмі значная колькасць цепласетак у краіне патрабуе замены. Як у сістэме энергетыкі, так і ў камунальнікаў. Каб больш-менш паспяваць за зношваннем гэтых сетак, трэба штогод мяняць іх (у прыватнасці ў сістэме энергетыкі) 200 кіламетраў. Карацей кажучы, работы хапае. А менавіта толькі ўказаную тэхналогію цяпер і належыць выкарыстоўваць.

І яшчэ некалькі лічбаў. У прыватнасці, адносна той жа эфектыўнасці. На адным кіламетры папярэдне ізаляванай трубы за ацяпляльны сезон можна зберагчы цеплавой энергіі на 15 тысяч долараў. А эканомія паліва за кошт укаранення, напрыклад, 100 кіламетраў такіх труб забяспечвае эканомію сродкаў на суму да 600 тысяч долараў.

Дапоўнім наш расказ наступным фактам: на «Бел-Ізаліце» ў мінулым годзе створана свая праектная група, якая можа падрыхтаваць усю адпаведную дакументацыю на будаўніцтва, рэканструкцыю і капітальны рамонт цеплавых сетак, забяспечыць аўтарскае суправаджэнне свайго праекта, аказаць заказчыку рознага роду кансультацыйную дапамогу. Напрыклад, па ацэнцы стану яго цеплавых сетак. Як адзначаюць на прадпрыемстве, стварэнне такой групы ў цэлым павышае якасць і эфектыўнасць усёй работы.

І ў заключэнне варта ўдакладніць: на «Бел-Ізаліце» таксама выпускаюць ПІ-трубы на базе шклапластыку і поліпрапілену.

**Іван БАРАНОЎСКІ.**
**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**



***НА ЗДЫМКАХ:***
*1. Намеснік генеральнага дырэктара Леанід ЗУБКОЎСКІ.*
*2. Падчас тэхпрацэсу.*
*3. Ідзе запеньванне трубы. На пярэднім плане Максім КАРПОВІЧ.*
*4. Начальнік сектара дагавораў Максім САДОЎСКІ і юрысконсульт Настасся ЛОЙКА.*
*5. Начальнік цэха Святаслаў АБРАЖЭВІЧ.*
*6. Вядучы інжынер-канструктар Аляксандр КАНСТАНЦЮК.*
*7. Намеснік генеральнага дырэктара Яўген МАКСІМОВІЧ і загадчык складской гаспадаркі Уладзімір ПЕРШЫН.*
*8. Слесар па зборцы вузлоў і дэталяў трубаправодаў Яўген ЛІТВІН.*
*9. Апаратчык Максім ВАРАПАНАЎ.*







## Сёння

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.11 | 17.36 | 10.25 |
| Віцебск — | 7.03 | 17.23 | 10.20 |
| Магілёў — | 7.01 | 17.26 | 10.25 |
| Гомель — | 6.55 | 17.25 | 10.30 |
| Гродна — | 7.26 | 17.52 | 10.26 |
| Брэст — | 7.23 | 17.55 | 10.32 |

### Месяц

***Першая квадра у 9.56. Месяц у сузор'і Блізнятаў.***

### Імяніны

**Пр.** *Сафрона, Яфима;*
**К.** *Катарыны, Габрыеля, Марка, Шымана.*

## Надвор'е на заўтра




## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА | -4 — +2 °С | |
| ВІЛЬНЮС | -10 — -5 °С | Без ападкаў |
| КІЕЎ | -14 — -8 °С | Без ападкаў |
| МАСКВА | -22 — -16 °С | Без ападкаў |
| РЫГА | -12 — -7 °С | Без ападкаў |
| С-ПЕЦЯРБУРГ | -17 — -9 °С | Без ападкаў |

## 24 лютага

### Дзве даты

**1662 год** — нарадзіўся Мацей Карскі, беларускі філосаф і правазнаўца. Вучыўся ў Віленскай акадэміі, Полацкім езуіцкім калегіуме. Пазней з'яўляўся рэктарам гэтых навучальных устаноў. Аўтар «Курса філасофіі і логікі».

**1874 год** — у Англіі афіцыйна з'явіўся на свет тэніс — адно з самых папулярных і відовішчных спартыўных спаборніцтваў, карані якога ідуць з часоў Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма, дзе культавалася гульня з маленькім мячыкам і ракеткай.

### Цытата дня:

***«Хто бачыць вельмі далёка — неспакойны сэрцам. Не бядуй ні аб чым загадзя і не радуйся таму, чаго яшчэ няма».***

**Літаратурны помнік Старажытнага Егіпта.**

Віншую з днём нараджэння **Валюшу ШПЕТ** з г. Барысава.
*Бачыць твар твой вясёлы і мілы*
*Я хацеў бы цяпер і заўжды.*
*Хай жа Божухна дасць табе сілы*
*І не шле аніякай бяды.*
**Анатоль.**

**БАНДАРЭВІЧ Ядзвігу Браніславаўну**
з в.Драздоўшчына, Стаўбцоўскага раёна
**віншуюць з 60-годдзем МУЖ, СЫН, ДАЧКА, ЗЯЦЬ**
*Пусть эта знаменательная дата*
*В душе твоей оставит добрый след.*
*Всего тебе – чем жизнь богата:*
*Здоровья, счастья, мира, долгих лет!*

Нашы шчырыя віншаванні з 50-гадовым юбілеем і пажаданні моцнага здароўя, поспехаў у працы, сямейнага дабрабыту цудоўнай жанчыне, любячай матулі, клапатлівай бабулі **Ірыне Рыгораўне ВЕЧАРОВАЙ** з г. Расоны.
*Ад шчырага сэрца ў дзень юбілею*
*Жадаем радасці, светлай надзеі,*
*Шчасця табе ў будні і ў святы,*
*Хай добрыя весткі прыходзяць у хату.*
**З павагай Валянціна і Мікалай,** *г. Мінск.*

## Усміхнёмся!

Размова двух генетыкаў:

— Ну як там ваша новая бульба? Ну тая, з генетычнымі мадыфікацыямі? На мой погляд, поўнае глупства!

— Цішэй! Яна можа пачуць...

☺

**Інструктар па гарналыжнаму спорту:**

**— Такім чынам, курс нашага навучання складаецца з трох раздзелаў: надзяванне лыж, спуск з гары, карыстанне кастылямі.**

☺

— Які самы лепшы падарунак мужчыне на 23 лютага?

— Выхадны 24-га!!!

☺

**— Шкада, што вы так рана сыходзіце. А мы тут такі стол да Дня абаронцаў падрыхтавалі. Можа возьмеце сухім пайком?**

**— Хіба толькі вадкім...**

**УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ГИДРОМАШ» г. КОБРИН**

**29 марта 2007 года состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Гидромаш» г. Кобрин.**

**Собрание пройдет по адресу: г. Кобрин, ул. Советская, 109, зал заседаний, 4 этаж.**

***Повестка дня собрания:***

1. Отчет дирекции об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2006 году. Утверждение основных целевых прогнозных показателей социально-экономического развития Общества на 2007 год.
2. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе в 2006 году.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2006 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2006 год.
5. Об утверждении распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества и выплате дивидендов за 2006 год.
6. Утверждение направлений использования прибыли, остающейся в распоряжении Общества на 2007 год.
7. Об утверждении Устава Общества в новой редакции.
8. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.
9. Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
10. Об аффилированных лицах Общества.

Регистрация участников собрания с **13.00 по месту проведения собрания.**
Начало работы собрания — **29 марта 2007 г. в 14.00.**
Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на **20 февраля 2007 года.**
Для регистрации при себе иметь следующие документы:
акционеру общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.
Обращаем ваше внимание, что все расходы акционеров, связанные с участием в собрании (проезд к месту проведения, проживания и др.) покрываются за счет средств акционеров.
Независимо от вашего личного присутствия на собрании начисленные дивиденды будут перечислены вам в соответствии с заключенным ранее договором.

**Наблюдательный совет ОАО «Гидромаш» г. Кобрин.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; прыём рэкламы і аб'яў тэл./факс: 287-17-79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.
html: www.zvyazda.minsk.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 37.095. Індэкс 63850. Зак. № 1095. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12